Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу" Серыя

**№ 3 (69) ' 2008**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**М. І. МІНІЦКІ — галоўны рэдактар,** *доктар гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ — першы намеснік галоўнага рэдактара,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар**
**І. І. БАГДАНОВІЧ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН,** *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ШУТАВА,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. У. ЖЭРКА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**

**У. В. ТУГАЙ — старшыня**
**М. М. ЗАБАЎСКІ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА,** *доктар педагагічных навук*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН,** *доктар педагагічных навук, прафесар*



**Заснавальнік і выдавец —**
**РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

220070, г. Мінск, вул. Будзённага, 21; тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу), факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by, http://www.aiv.by

# ІНАВАЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ: УКЛАД ГІСТОРЫКАЎ

***У вышэйшых навучальных установах актыўна аналізуюцца высновы І з'езда вучоных Беларусі, галоўную з якіх можна сфармуляваць так: навука павінна ўнесці вырашальны ўклад у інавацыйнае развіццё нашай краіны. У дачыненні да сферы матэрыяльнай вытворчасці задача больш чым зразумелая. Але ёсць яшчэ сацыяльна-гуманітарныя, псіхолага-педагагічныя навукі. Якая іх роля ў інавацыйным развіцці краіны? Сваю думку выказвае дэлегат з'езда, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры новай і найноўшай гісторыі БДПУ імя Максіма Танка Генадзь Аркадзьевіч Космач. Падчас І з'езда вучоных Беларусі ён быў узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі».***

***Г. А. Космач развівае на кафедры новай і найноўшай гісторыі БДПУ імя Максіма Танка такі напрамак, як германістыка. А калі казаць дакладней, то яго навуковыя інтарэсы — гісторыя германскіх палітычных партый і гісторыя беларуска-германскіх адносін. Генадзь Аркадзьевіч — аўтар шматлікіх навуковых артыкулаў, трох манаграфій, сааўтар і навуковы рэдактар шэрага вучэбных дапаможнікаў па сусветнай гісторыі новага і найноўшага часу для 12-гадовай агульнаадукацыйнай школы. Падрыхтаваў двух дактароў і 14 кандыдатаў навук, многія з якіх умацавалі прафесарска-выкладчыцкі склад БДПУ імя Максіма Танка.***

## Да эканомікі ведаў праз грамадства ведаў

*Г. А. Космач:* на І з'ездзе вучоных Беларусі было шмат сказана пра выкарыстанне вынікаў навуковай дзейнасці ў эканоміцы. У дачыненні ж да псіхолага-педагагічных і сацыяльна-гуманітарных навук можна гаварыць пра ўкараненне вынікаў даследаванняў у вучэбны працэс. Для нас, гісторыкаў, фундаментальныя даследаванні цесна звязаны з практыкай выкладання. Навука павінна ісці ў авангардзе пабудовы эканомікі ведаў, але яе можна стварыць толькі ў грамадстве ведаў. Гэтую думку выказаў Нобелеўскі лаўрэат Жарэс Алфёраў, і я з ім абсалютна згодны. Гісторыя — адна з навук, на якой базіруецца фарміраванне асобы, грамадзянскай пазіцыі, а ў выніку — і грамадства ведаў.

На з'ездзе (у прыватнасці, падчас працы ў секцыі гуманітарных навук і мастацтва) вучоныя-гуманітарыі выказалі занепакоенасць, што дысцыпліны сацыяльна-гуманітарнага цыкла паступова саступаюць свае пазіцыі ў вучэбным працэсе вышэйшай школы. Нездарма ў рэзалюцыі секцыі адзначана, што такую тэндэнцыю варта пераадольваць, інакш гэта адмоўна адаб'ецца на ўзроўні падрыхтоўкі спецыялістаў.

Гісторыкі назвалі і шэраг іншых актуальных задач. Напрыклад, патрабуецца стварэнне абагульняльных прац па гісторыі Беларусі — ад старажытных часоў да нашых дзён. Неабходна распрацоўка падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для сярэдніх спецыяльных навучальных установ і ВНУ. У прыватнасці, вучэбнай літаратуры айчыннага паходжання для вышэйшай школы амаль няма.

### Універсітэцкая навука — школе

Пра вынікі даследаванняў вучоных-гісторыкаў, супрацоўнікаў кафедры, якую ўзначальвае Г. А. Космач, ён расказаў больш падрабязна. У якасці прыкладу прывёў нядаўна абароненую доктарскую дысертацыю дацэнта М. І. Мініцкага. Яна стала першай у краіне працай, прысвечанай інавацыйным тэхналогіям прадстаўлення навуковых і адукацыйных гістарычных ведаў. Па сутнасці, у ёй выкладзены новыя падыходы да стварэння універсітэцкіх і школьных падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных матэрыялаў. На аснове рэкамендацый вучонага супра-

цоўнікі кафедры (да 2004 г. была кафедрай агульнай гісторыі) распрацавалі для 11-гадовай агульнаадукацыйнай школы комплекс новых вучэбных праграм, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў па сусветнай гісторыі найноўшага часу, тым самым забяспечыўшы вучэбны працэс практычна для ўсіх класаў (акрамя шостага і дзевятага).

Два гады таму на кафедры з'явіўся першы ў гістарычнай адукацыі Беларусі вучэбны дапаможнік па новай гісторыі для ВНУ (аўтары — дацэнт Р. А. Чыкалаў і прафесар І. Р. Чыкалава). Дапаможнік паспеў стаць вядомым на постсавецкай прасторы гэтак жа, як працы М. І. Мініцкага і іншых супрацоўнікаў кафедры.

Перад вучонымі стаіць задача стварыць падручнікі новага пакалення для 12-гадовай школы. У мінулым годзе з удзелам супрацоўнікаў кафедры новай і найноўшай гісторыі выйшлі два першыя ў краіне падручнікі па сусветнай гісторыі найноўшага часу для IX і X класаў 12-гадовай школы (сааўтар і рэдактар — Г. А. Космач).

Але найперш вучоныя кафедры займаюцца тэарэтычнай, фундаментальнай распрацоўкай гістарычных праблем. Тут развіваюцца тры напрамкі: германістыка (адпаведная школа створана ўпершыню ў рэспубліцы, кіраўнік — Г. А. Космач); развіццё інавацыйных метадаў прадстаўлення гістарычных ведаў (гэты напрамак распрацоўвае М. І. Мініцкі); гендэрныя даследаванні (кіраўнік — І. Р. Чыкалава). У апошні час з'явіліся маладыя спецыялісты ў галіне амерыканістыкі.

**Падрыхтаваць вучонага... па плане?**

На І з'ездзе вучоных Беларусі адной з цэнтральных была тэма падрыхтоўкі маладой змены. Як вучоны, які шмат зрабіў для гэтага, Г. А. Космач занепакоены апошнімі змяненнямі ў рабоце аспірантуры і навуковым кіраўніцтве дысертацыямі. З мінулага года аспірантура перайшла на кантрактную форму навучання, і гэтае новаўвядзенне, на яго думку, паказала сябе з адмоўнага боку. Паводле кантракта, чалавек, які паступае ў аспірантуру, абавязаны быць працаўладкаваным або на рыхтуючай кафедры, або ў арганізацыі-заказчыку. Па сутнасці, гэта азначае мэтавую падрыхтоўку. Што ж тут заганнага?

*Г. А. Космач:* як загадчык кафедры не магу дазволіць падрыхтоўку маладога таленавітага аспіранта, бо ў такім выпадку мне прыйшлося б звольніць аднаго з супрацоўнікаў. Доступ у аспірантуру стаў абмежаваным. Па-за кантрактам можна вучыцца толькі платна, а гэта дазволіць сабе не кожны таленавіты выпускнік універсітэта. Таму ўжо цяпер мы заўважаем зніжэнне або і ўвогуле знікненне конкурсу пры паступленні ў аспірантуру. Пры такім становішчы ў найбліжэйшай будучыні магчымы праблемы з пераемнасцю кадраў. Па маіх ацэнках, прыкладна праз пяць гадоў адчуецца кадравы голад.

Але галоўны недахоп такога падыходу ў тым, што ён перашкаджае станаўленню і развіццю навуковых школ, лічыць Г. А. Космач:

— Цяжка фарміраваць школу на кантрактнай аснове. І гэта датычыцца не толькі гістарычнай навукі. Навуковая школа фарміруецца тады, калі вакол яе заснавальніка, доктара навук, сканцэнтравана 15–20 чалавек. Не спрыяюць развіццю школ і ўведзеныя абмежаванні колькасці вучняў на аднаго навуковага кіраўніка — зараз іх можа быць не больш за чатыры. Мяркую, што падобная практыка не прыжывецца — занадта шмат крытыкі выказваюць вучоныя на адрас гэтых новаўвядзенняў. Падрыхтаваць вучонага па жорсткім плане ці па заказе — вельмі цяжка, бо гэта тонкая творчая справа.

*Інтэрв'ю Іны Нікіценка*